ПРЫВІТАНЬНЕ II ПЛЕНУМУ-УДАРНІКУ 3-ГА. РАШАЮЧАГА

РОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 59 (1328) | ПЯТНІЦА, 13-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Буржуазны друк аб прамове тав. Молатава

ЛЁНДАН, 10. Прамова тав. Молатава ў частцы, што датыкалася замежнай палітыкі савецкага ўраду, апублікавана амаль ва ўсіх ангельскіх газэтах.

Консэрватыўная прэса публікуе паведамленьне аб прамове тав. Молатава, прасякаючы яго варожымі камэнтарыямі.

Большасьць газэт старанна замоўчвае заявы тав. Молатава ў адказ на паклёпніцкую кампанію ангельскіх цьвёрдалобых у пытаньні аб „нявольніцкай працы“ у СССР і ў прыватнасьці зусім не ўпамінаюць прапановы аб абмене рабочымі дэлегацыямі для абсьледваньня ўмоў працы ў СССР і ў Брытанскай імпэрыі.

Да другога пленума

IX зьезд УсеЛКСМ паставіў пе- д комсамолам цэнтральную проб- му—больш шырокі ахоп вызна- ных партыяй пытаньняў будаў- цтва соцыялізму. Гэта значыць, то саюз, зьдзейсьніўшы ў асноў- ым наварот тварам да задач цыялістычнай рэконструкцыі, на вым этапе свайго разьвіцьця па- нен будзе, пад кіраўніцтвам кому- стычнай партыі, ажыцьцявіць рад вых, якасна больш высокіх і кладаных задач. „Саюз павінен ырэй і больш актыўна разгар- уць свой удзел у будаўніцтве, янаваньні, рацыяналізацыі і аў- даньні новай тэхнікай“.

Тэхніка ў рэконструкцыйны пэ- ыяд вырашае ўсё,—так тав. Ста- ін, на зьезьдзе прамысловых работ- ікаў, ахарактарызаваў значэньне ўладаньня тэхнікай. Гэта значыць, то бальшавіцкая формула „расій- кі рэволюцыйны размах плюс мэрыканская дзелавітасьць“ павін- а праніваць усю практычную зейнасьць комсамольскіх організа- ый.

Організаваць шырокія масы ком- амольцаў і працоўнай моладзі на рактычнае ажыцьцяўленьне кон- рэтных задач будаўніцтва соцыя- ізму, злучыць гэтую работу з аў- аданьнем тэхнікай і рэволюцыйнай эорыяй, гэта значыць організаваць асы ў барацьбе з клясавым вора- ам, яго агентурай-опортуністымі, эта азначае па бальшавіцку весьці асы ў соцыялістычным наступлень- і.

Магутны рост СССР адбываецца а фоне ўвесь час паглыбляюча- ася экономічнага крызісу ў капі- алістычных краінах. Рост соцыя- ізму ў СССР, з аднаго боку, і ост крызісу ў капіталістычных раінах, з другога боку, абвастра- оць клясава-варожую дзейнасьць ўнутранага клясавага ворага, і су- ьветнай буржуазіі.

Згубіўшы ўсякія надзеі на „мір- ае перараджэньне“ савецкае ўла- ы, сусьветная буржуазія пры да- амозе сваіх верных лёкаяў соцы- л-дэмакратаў узмоцнена рыхтуе ўзброены напад на СССР.

Інтэрвэнцыя зараз зьяўляецца цэнтральнай восьсю, вакол якой групуюцца ўсе варожыя савецкаму Саюзу сілы. Гэта з усёй выразна- сьцю сьвярджаюць выкрытыя адна за другой шкодніцкія інтэрвэнцы- янісцкія організацыі ў СССР; „прам- партыяй“, „саюзнае бюро“ РСДРП меншавікоў, кулацка - эсэраўская група Чаянава, інтэлігенцкая група беларускіх контррэвалюцыўных нацыянал-дэмократаў і тыя антысавецкія кампаніі, якія мелі месца за апошнія часы на міжнародным антысавецкім „рынку“.

Другі пленум ЦК ЛКСМБ сабраўся ў адказьнейшы пэрыод. Ён вырашыць шэраг важнейшых пытаньняў практычнай дзейнасьці ЛКСМБ.

Забясьпечваючы самую няпрымірымую барацьбу на два фронты, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, „левых“ загібаў, з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні і прымірэнцтвам да ўхілаў, комсамольскія організацыі павінны будуць рэалізаваць рашэньні пленума і баявыя маршруты комсамольскіх зьездаў.

Выкананьне праграмы 3-га, рашаючага году пяцігодкі патрабуе ўзмацненьня ўдзелу комсамолу на конкрэтных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Комсамольскія ячэйкі павінны мобілізаваць усе свае сілы і рэсурсы на змаганьне ня толькі за колькасьць, але і за якасьць. Ліквідаваць адставаньне такіх вучасткаў, як транспорт, аўладаць тэхнікай, справай разьвіцьця вышэйшых форм соцыялістычнага спаборніцтва, унядрыць яго ў галіну навукі і тэхнікі—вось нізка задач, над якімі павінна працаваць комсамольская організацыя гораду.

Пасьпяховая падрыхтоўка і правядзеньне другой бальшавіцкай вясны патрабуюць ад вясковых комсамольскіх організацый вялізарнай адказнасьці. Забясьпечыць 30 процантную колектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, узмацніць барацьбу за спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі, за разьвіцьцё тэхнічных культур, жывёлагадоўлі, аўладаць мэханікай пляннаваньня, ажыцьцявіць пляны контрактацыі, — вось нізка задач для комсамольскіх організацый вёскі.

Усе гэтыя пытаньні будуць прадметам абгаварэньня пленуму. Пленум заслухае даклады аб ходзе падрыхтоўкі комсамольскіх організацый да вясновага севу, аб удзеле ЛКСМБ у рабочым забесьпячэньні, аб становішчы вайсковай работы ЛКСМБ, аб барацьбе за тэхніку і за якасьць. Гэтыя пытаньні зьяўляюцца важнейшымі пытаньнямі, над якімі будзе працаваць Беларуская організацыя комсамолу па рэалізацыі рашэньняў X зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ.

„Па ўсіх дарогах ужываць у шырокім маштабе спараную і трайную язду, абавязаўшы НКШЗ не пазьней 20 II зусім вывесьці з практыкі абасобленую язду...“
(З адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК).

ЯК ВЫКАНАНА ГЭТА ДЫРЭКТЫВА?

Сёньня а 3-й гадзіне дню, рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ склікае нараду па гэтаму пытаньню.

Прысутнасьць сэкратароў Менскага, Віцебскага, Гомельскага, Аршанскага гаркомаў, Жлобінскага, Асіпавіцкага, Магілеўскага райкомаў, сэкратароў отацыйных камітэтаў і чыгуначнікаў—членаў пленуму ЦК ЛКСМ абавязкова.

Запрашаюцца прадстаўнікі бюро ЦК чыгуначнікаў, упаўнаважаны Наркомшляху.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ (Карла Маркса, 38).

РЭДАКЦЫЯ.

VI Усесаюзны Зьезд Саветаў

Перамагаючы цяжкасьці, мы заваёўваем позыцыю за позыцыяй на фронце соцыялістычнага будаўніцтва

(Спрэчкі па дакладу т. Молатава)

Казакстан бурна разьвівае соцыялістычную гаспадарку

На ранішнім пасяджаньні зьезду саветаў, 9 сакавіка, пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Молатава. Выступіўшы першым у спрэчках тав. В. Ларын (Масква), спыняючыся на задачах культурнай рэволюцыі, указаў на неабходнасьць значна павялічыць выпуск масавай кнігі, асабліва падручнікаў, і зрабіць яе больш таннай.

Тав. Ашвійцаў (Урал) адзначыў, што правільнасьць дзейнасьці саюзнага ўраду пацьверджана агромністымі посьпехамі, дасягнутымі ў прамысловасьці і соцыялістычнай перабудове вёскі.

Тав. Сокалаў (Казакстан) адзначыў, што, з адсталай акраіны ў часы царызму, **Казакстан пры савецкай уладзе бурна разьвівае соцыялістычную прамысловасьць і сельскую гаспадарку.**

Тав. Пахомаў (Ніжні Ноўгарад) адзначае, што нізавыя органы саветаў дагэтуль яшчэ не перабудаваліся па-новаму, прыстасавальна да новых тэмпаў работы, і гаворыць аб неабходнасьці хутчэйшага ажыцьцяўленьня рашэньняў партыі і ўраду аб перабудове работы саветаў.

Тав Піваварaў (паўночны Каўказ) гаворыць аб агромністых посьпехах колектывізацыі на паўночным Каўказе, дзе ахоплена колгасамі каля 77 проц. усіх сялянскіх гаспадарак, а ў некаторых краёвых раёнах 82 проц.

На вячэрнім паседжаньні 9 сакавіка выступіла тав. Шалашова (ЦЧВ)

Тав. Качалін (рабочы чыгункі), гаворачы аб палепшаньні работы чыгуначнага транспорту, дзеліцца вопытам работы скразной брыгады свайго дэпо, рабочыя якога за 11 дзён выпусьцілі з рамонту 64 паравозы, замест 61 па пляну.

СССР—грандыёзная соцыялістычная будоўля

Тав. Зімін (Усходні Сібір) гаворыць аб пасьпяховым вырашэньні Урала-Кузьнецкай проблемы. Тав. Капылаў (Украіна) на цэлым шэрагу прыкладаў даводзіць, што бядняцка-серадняцкія масы пераканаліся ў правільнасьці лініі партыі і савецкай улады.

Тав. Антыпаў (Нарком Пошт і тэлеграфаў), адзначаючы на шэраг буйнейшых недахопаў у рабоце сувязі гаворыць, што Наркампоштэль зараз перабудоўваецца для хуткай падрыхтоўкі новых кадраў.

У спрэчцы 9 сакавіка, у вечары выступіў з вялікай прамовай аб ваеннай небясьпецы нам. Наркомваенмора—тав. С. С. Каменеў.

На ранішнім паседжаньні 10 сакавіка працягваліся спрэчкі. Дэлегаты ў прамовах разгортваюць малюнак грандыёзнай соцыялістычнай будоўлі, якою ахоплена ўся краіна ад цэнтру да самых адлеглых акраін. Выступаўшыя аднагалосна сьведчаць аб агромністым творчым энтузіязьме працоўных мас гораду і вёскі, перамагаючых перашкоды на шляху пераможнага прасоўваньня да канчатковай мэты—пабудовы соцыялістычнай грамады.

З вялікай увагай зьезд выслухаў прамову начальніка Кузьнецбуду тав. Франфуркта. У спрэчках выказаліся тав. Хаджаеў і тав. Яраслаўскі.

На вячэрнім паседжаньні 10 сакавіка спрэчкі працягваліся.

Тав. Брыкаў (Сярэдняя Волга), гаворыць. што Сярэдняволскі край колектывізаваны звыш, чым на 50 проц. Вырашэньне гэтай важнейшай проблемы дасту пна толькі плянавай соцыялістычнай гаспадаркі.

Яны абламаюць штыхі

У спрэчках выступіў старшыня Саўнаркому БССР тав. Галадзед.

Тав. Галадзед, напамінаючы словы тав. Молатава аб тым, што адносіны з Польшчай прымушаюць жадаць шмат лепшага, гаворыць што работнікі Беларусі, будуючы соцыялізм на мяжы з Польшчай, асабліва адчуваюць недастатковасьць добрасуседзкіх адносін.

— Увесь Польскі друк,—гаворыць тав. Галадзед—перапоўнены хлусьлівымі і паклёпніцкімі паведамленьнямі аб Савецкім саюзе і асабліва аб нацыянальнай політыцы савецкай Украіны і Беларусі. Размовы польскага друку аб савецкім „дэмпінгу“ зьяўляецца дымавой заслонай, за якой падрыхтоўваецца напад на СССР.


— Мы будуем соцыялізм і нікому не дазволім парушыць гэта будаўніцтва,—гаворыць у заключэньне тав. Галадзед.—Калі капіталістыя імкнуцца нас прашчупаць штыхом з Захаду, як яны імкнуліся гэта зрабіць ў 1929 гаду з усходу, дык іх засьцігне той-жа лёс, што і на ўсходзе: яны абламаюць сваю штыхі.

Выступіўшыя далей ў спрэчках прадстаўнікі Казакстану, Кіргізіі, Бакшыры гавораць аб разьвіцьці малых нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу і прыводзяць шэраг адпаведных фактаў.

Неабходна цеснае яднаньне навукі і працы

На ранішнім паседжаньні 11 сакавіка працягваліся спрэчкі.

Адзін за адным на трыбуну зьезду ўсходзяць прадстаўнікі абласьцей, раёнаў, заводаў і колгасаў У сваіх выступленьнях яны даюць яскравы малюнак становішча на



Тав. СТАЛІН на зьезьдзе

мясцох. Паўсюды працоўныя масы перамагаючы цяжкасьці, захопліваюць позыцыю за позыцыяй на фронце соцыялістычнага будаўніцтва

Выступіўшы ад імя Усесаюзнай асоцыяцыі работнікаў навукі і тэхнікі Варнітсо, акадэмік, БАХ, падкрэсьлівае, што для посьпеху нашага савецкага будаўніцтва абсолютна неабходна цеснае яднаньне навукі і працы.

— Усе рашэньні, — гаворыць тав. Бах, —якія вы тут вынесеце, мы будзем з усёй энэргіяй, на якую мы здольны, ажыцьцяўляць. Калі імпэрыялістычныя краіны пойдуць на вайну, з нашым саюзам, мы члены асоцыяцыі, аддамо ўсе свае веды, усе свае сілы на абарону соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Панскай польшчы не ўстаяць перад рэволюцыйным шквалам

Тав. Горын (Беларусь) расказвае аб дасягненьнях у Савецкай Беларусі. Крывавая мяжа імпэрыялізму падзяляе Беларусь на дзьве часткі, гаворыць прамоўца. У Заходняй Беларусі адна трэцяя частка лепшай зямлі належыць абшарнікам. Я даводжу да ведама зьезду—гаворыць тав. Горын,—што абавязацельствы, узятыя адносна меншасьцяй, Польшчай ня выконваюцца. У Заходняй Беларусі зачынены ўсе школы, дзе вядзецца выкладаньне на мовах нацменшасьцяй. Там праводзіцца высачэзная колёнізацыйная політыка.

— Заходняя Беларусь будзе савецкай. Пролетарская рэволюцыя няўхільна, і панскай Польшчы не ўстаяць перад рэволюцыйным шквалам.

Тав. Вайнбэрг (ВЦСПС) перадае прывітаньне зьезду ад ВЦСПС. У сувязі з кампаніяй буржуазнага друку аб прымусовай працы тав. Вайнбэрг прыводзіць рад фактаў і лічбаў, якія малююць становішча працы і быту рабочых і работніц у СССР.

Да пленуму ЦК ЛКСМБ

Б'ЕМ ТРЫВОГУ!

Зімовы набор у школы ФЗВ праходзіць недапушчальна марудна. Комсамольскія організацыі дрэнна змагаюцца за правядзеньне набору

У БАРАЦЬБЕ ЗА МАКСЫМУМ—ПЕРАМАГЧЫ

Гэтымі днямі адбылася нарада гаспадарнікаў і прадстаўнікоў комсамольскіх колектываў па пытаньню хода зімовага набору ў ФЗВ. Нарада, скліканая рэдакцыяй газэты „Чырвоная Зьмена“ і гаркомам комсамолу высьвятліла, што сыгналы газэты аб пагрозе зрыву набору ў ФЗВ засталіся не пачутымі, да апошняга дню нічога ня зроблена па забесьпячэньню пасьпяховага правядзеньня набору.

Опортуністычная недааацэнка, не жаданьне змагацца з цяжкасьцямі, якія стаяць на шляху, прывялі да таго, што за 1-ю дэкаду сакавіка месяца было набрана ўсяго 11 чалавек.

Гэтая опортуністычная практыка, якая праводзіцца асобнымі гаспадарчымі організацыямі, праходзіць пры маяўнай дапамозе асобных комсамольскіх колектываў, якія не павялі барацьбу за выкананьне вызначаных комсамолам контрольных лічбаў набора.

Той факт, што сэкратар комсамольскага колектыву друкарні імя Сталіна Катков нічога ня мог сказаць на нарадзе акрамя таго, што не магчыма правесьці набор, сьведчыць аб многім.

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову бюро Менгаркому і матар'ялы з мейсц, якія сьведчаць аб тым, што у радзе гарадоў і раёнаў ня было карэннага пералому і што становішча з наборам знаходзіцца ў крытычным становішчы.

Вынікам права-опортуністычнай недаацэнкі ролі ФЗВ і ўпартага супраціўленьня, нежаданьня выконваць пастановы партыі і ўраду зьяўляецца зрыў зімовага набору ў ФЗВ і той факт, што Будаб'яднаньне толькі 3-га сакавіка дало дырэктыву аб зімовым наборы. Бюро констатуе зрыў лютаўскага набору па мэталюргічнай і швэйнай прамысловасьці і лічыць, што пастанова партыі аб наборы 6.000 павінна быць выканана.

Адносіны да зімовага набору з боку поліграфічнай прамысловасьці, будмэталь і швэйаб'яднаньня бюро разглядае як права-опортуністычную практыку і просіць бюро гаркому партыі неадкладна заняцца гэтым пытаньнем, прыцягнуўшы да суровай адказнасьці вінаватых у гэтым зрыве.

Адсутнасьць контыгенту для прыёму ў школы, выкліканая нежаданьнем гаспадарчых аб'яднаньняў заняцца падрыхтоўкай падлеткаў у ФЗВ, прыводзіць да фактычнага зрыву асноўных установак па пытаньню падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых праз ФЗВ. Бюро адзначае адсутнасьць інтэрнатаў, майстэрняў, падручнікаў, вучэбных прылад, імкненьне зьвесьці да мінімуму колькасьць набору ў школы ФЗВ, беспадстаўныя складаньні кантрольных лічбаў, якія зьяўляюцца зусім нерэальнымі, бо яны ні ў якім разе не забясьпечаць патрэбы растучай прамысловасьці.

Разам з гэтым, бюро Гаркому КСМ адзначае бязьдзейнасьць комсамольскіх колектываў у справе падрыхтоўкі да зімовага набору, організацыі грамадзкай думкі вакол гэтага пытаньня. Бюро разглядае, як права-опортуністычныя, адносіны да гэтай справы сэкратароў комсамольскіх колектываў Каткова і Кагана, якія зьяўляюцца абаронцамі права-опортуністычнай практыкі гаспадарчых аб'яднаньняў імкнуцца ўзяць пад сваю апску бязьдзейнасьць поліграфтрэсту і швэйаб'яднаньня.

Комсамольскія організацыі павінны зараз-жа разгарнуць працу па барацьбе за пасьпяховае правядзеньне набору ў ФЗВ. Зусім нездавальняючая мінімальная лічба, вызначаная ВСНГБ, павінна быць перавыканана і даведзена па дзяржаўнай прамысловасьці да 5200.

Мы лічым, што думкі аб скарачэньні зімовага набору за лік рэарганізацыі прафшкол павінны быць самым рашучым чынам адхілены і набор павінен даць сапраўды бальшавіцкія паказчыкі.

Пленум ЦК ЛКСМБ павінен сказаць па гэтаму пытаньню сваё слова.

Рашуча асуджаючы выступленьні тав. Каткова і Кагана на нарадзе гаспадарнікаў і сэкратароў комсамольскіх колектываў, скліканай Гаркомам і „Чырвонай Зьменай“ па пытаньню лютаўскага набору, бюро лічыць, што гэтыя выступленьні знаходзяць поўнае праламленьне ў практыцы комсамольскіх колектываў поліграф і швэйаб'яднаньняў.

Лічачы такое становішча далей нецярпімым, бюро Гаркому абавязвае ўсе комсамольскія колектывы і ячэйкі, пры якіх існуюць ФЗВ, у тэрміновым парадку правесьці наступнае:

Прапанаваць колектыву заводу „Энэргія“, „Комунар“, МШВ, Швэйаб'яднаньне, „Кастрычнік“, ВЭО, Белдзяржбуд, Белжылсаюз, МЦРК разгарнуць шырокую працу па організацыі грамадзкай думкі і правядзеньні зімовага набору ў ФЗВ. Праверыць усе магчымасьці скарыстаньня памяшканьняў і абсталяваньня, паставіўшы на агульных сходах комсамолу і рабочых пытаньне аб максімальным павялічэньні кантрольных лічбаў зімовага набору.

Комсамольскім колектывам і ячэйкам прыняць усе захады да забясьпечаньня пасьпяховага скончаньня капітальнага будаўніцтва.

Ячэйкам і колектывам комсамолу Будаб'яднаньня паставіць у цэнтр сваёй працы пытаньне аб самым хуткім скончаньні капітальнага будаўніцтва ФЗВ.

Комсамольскім ячэйкам разгарнуць працу па вярбоўцы падлеткаў у ФЗВ, цьвёрда прытрымліваючыся забясьпечаньня якасьці паказчыкаў прымаемых, недапушчаючы зьніжэньня агульна-адукацыйнай базы і соцыяльнага набору.

Уся праца комсамольскіх ячэек і колектываў па ўдзелу ў лютаўскім наборы павінна быць самым цесным чынам увязана з падрыхтоўкай і правядзеньнем 10-годзьдзя ФЗВ.

Віцебск

У палоне міжведамственнай грызьні

Гаспадарчыя організацыі Віцебску да гэтага часу не клапоцяцца аб падрыхтоўцы і правядзеньні набору у ФЗВ. Няма патрэбных інтэрнатаў, абсталяваньня і г. д. Нават ня ведаюць адкуль будуць набраны падлеткі для ФЗВ.

Злачыннай міжведамственнай грызьнёю займаецца інспэкцыя працы па пытаньню аб вярбоўцы падлеткаў з вёскі ў ФЗВ. Інспэкцыя адмаўляецца, бо ёй нібы-та не дазволена НКП, а гаспадарнікі не бяруцца за гэтую справу, бо іх мабыць яна ня тычыцца. Такім чынам абедзьве організацыі нічога ня робяць.

Заводакіраўніцтва „Чырвонага Мэталістага“ не закончыла яшчэ будаўніцтва ліцейнага цэху ФЗВ і адбірае яго варштаты.

Дырэкцыя фабрыкі „Дзьвіна“ не аслабаняе памяшканьня пад інтэрнат, чым зрывае набор.

Трэба адзначыць, што грамадзкая думка, думка рабочых фабрык і заводаў не мобілізавана на барацьбу за выкананьне і перавыкананьні мінімальных кантрольных лічбаў. Абутнікі і будвуч адмовіліся ад набору, паставілі пад пагрозу падрыхтоўку кадраў для так важных галін вытворчасьці.

Брыгадзір „ЧЗ“
Рашвей.



Зімовы набор:—А мне расхлебваць прыдзецца

Палепшыць умовы фабзайцаў

Школа ФЗВ пры заводзе „Чырвоны Мэталісты“ знаходзіцца ў надзвычайна дрэнных умовах. Інтэрнат, у якім жывуць выхаванцы дзіцячых дамоў і вучні 1-га курсу, знаходзіцца ў надзвычайна антысанітарных умовах; падлога мыецца вельмі рэдка, бруд пануе ў інтэрнаце.

Сталоўкі пры інтэрнаце няма. Нават за кіпяткам вучням прыходзіцца хадзіць за некалькі кварталаў.

У сувязі з зімовым наборам, неабходна ўзяцца за палепшаньне бытавога становішча вучняў з тым, каб новы набор быў у лепшых умовах.

8 подпісаў.

Будвуч павінен жыць

Асеньні набор у Менскі будвуч Белдзяржбудаб'яднаньня быў сарваны з прычыны непадрыхтаванасьці і адсутнасьці памяшканьня. Гэта „об'ектыўная“ прычына стварае і зараз налўную пагрозу зрыв далейшых набораў.

Некалькі раз ставілі пытаньне аб пабудове спэцыяльнай школы. Пасьля доўгай цяганіны гэта пытаньне было нарэшце вырашана. Адпушчана 400 тысяч рублёў на пабудову будынку для будвучу. Уся справа ўпіралася ў пляц. Гарсавет не адпускаў месца для пабудовы.

Прайшло поўгода,—пляц дасталі. Рабочыя чарцяжы і пляны падрыхтаваны. Комсамольскі колектыў пасьпяшыў назваць гэтую пабудову школы будвуч ўдарнай пабудовай. Парткалектыў пастанавіў забясьпечыць гэтую пабудову ў першую чаргу матар'яламі. Усё ішло добра. Але раптам...

Адпушчаныя 400 тысяч рублёў на пабудову школы аднялі ад будвучу і перадалі на пабудову комбінату: політэхнікуму, інстытуту, разам за школай будвуч.

Будвучу абяцаюць вялікія мажлівасьці для працы, але гэтыя абяцаньні, ставяць пад наяўную пагрозу далейшае існаваньне будвучу.

Мы патрабуем каб аддзел кадраў ВСНГ тэрмінова вырашыў гэта пытаньне і лічым, што пабудова школы будвуч неабходна, або ва ўмовах комбінату яна зможа выхаваць патрэбныя кадры і даць жаданыя вынікі.

Вучань.

Гомель

Безадказныя адносіны

Зімовы набор у школы ФЗВ Гомлю зрываецца. Згодна вызначаных контрольных лічбаў, ФЗВ чыгуначнікаў павінна набраць 400 асоб і распачаць вучобу 15 сакавіка.

На сёньня падалі заявы, разам з вылучанымі са школ соц. выху, 428 асоб, з якіх дапушчаны да профадбору 302 асобы, прычым з гэтай колькасьці толькі 59 проц. дзяцей рабочых.

Тлумачыцца гэта безадказнымі адносінамі да комплектаваньня школ з боку комсамольскіх і профсаюзных організацый. Гаспадарчыя органы не забясьпечваюць патрэбным абсталяваньнем і ўмовамі новы набор.

Комсамольскія і профсаюзныя організацыі павінны ўзяцца за поўнае выкананьне і перавыкананьне контрольных лічбаў зімовага набору.

Жыткоўскі

Бабруйск

Без дапамогі

Засталося некалькі дзён да пачатку заняткаў вучняў зімовага набору, але Бабруйскі ФЗВ яшчэ да гэтага часу не пачаў набору ў школу. Ня гледзячы на пастановы РК КП(б)Б аб памяшканьні для ФЗВ, гэта пытаньне пакуль што ня вырашана.

Комсамольская ячэйка школы не знайшла дапамогі ў РК КСМ, які бязьдзейнічае і зусім не клапоціцца аб тым, каб забясьпечыць набор.

Фрайман

Магілеў


Раўняюцца на вузкія месцы

Лютаўскі набор у ФЗВ, будвучы і ШУМП'ы ў Магілеве праходзяць слаба. Ня гледзячы на тое, што ў ФЗВ чыгункі падана 30 заяў на 120 месц, процант дзяцей рабочых дасягае ўсяго 30, а пастаноўлена набраць ня менш 75 проц.

ФЗВ мэталістых, у сувязі з опортуністычнай устаноўкай ВСНГБ, адклаў свой набор.

Будвуч Белжылсаюзу і Росмасдору набірае толькі 25 чал., бо гаспадарчыя організацыі не адпускаюць для гэтага сродкі.

Брыгадзір „Ч.З.“—Гарэлік


За варштатам

Да пленуму ЦК ЛКСМБ

У ПАХОД ЗА НОВЫЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ГЕКТАРЫ

Колгас „Комбайн“ у першых шэрагах барацьбітоў за колгасны прыбой і контрактаўшчыкоў

„Нам непатрэбны ніякія межы“

Магутная хваля колгаснага прыліву ў Казловіцкім і Тароўскім с-саветах.

СЛУЦАК. 12 (па тэлефону) Брыгады, Райкому партыі і комсамолу якія працуюць на колектывізацыі і вясеньняй сяўбы у Казловіцкім і Тараўскім сельсаветах, дасягнулі значных посьпехаў у сваёй рабоце. У сельсаветах у апошні час наглядаецца магутная хваля колгаснага прыліву ў старыя колгасы і організацыя новых колгасаў.

У часе Сталінскага закліку бednякі і серадняки вёскі [illegible]лiўка (Казловіцкі сельсавет) у ліку 23 гаспадарак, або [illegible] проц. усёй вёскі організавалі новы колгас „Чырвоная [illegible]лiўка“.

У вёсцы Лясуны з 13 гаспадарак організаваўся колгас. Колгасьнікі распачалі працу па абагуленьню інвэнтара, жывёлы і насеньня.

У колгас „Чырвоная Зорка“ уступіла 8 гаспадарак.

Асабліва энэргічную працу па ўцягненьню ў колгасы праводзіць колгас „Комбайн“ (Тараўскі сельсавет). Створаны ініцыятыўныя групы, практыкуецца падворны абход.

У колгас амаль кожны дзень уступае па 10—15 гаспадарак. У апошнія дні у колгас уступіла 52 гаспадаркі, або [illegible] проц. вёскі Клякчаны. Кольгасьнікі адправілі назад зямямера, сказаўшы, што яны за 5—10 дзён усю вёску ахопяць колгасам і ім ня трэба ніякіх межаў.

Колгас „Комбайн“ законтрактававаў на 100 проц. яравыя пасевы.

Прыбытак.

Ссыпка насенфонду

Работа Сянікоўскіх комсамольцаў

прыклад для іншых

Сянікоўская комсамольская ячэйка, Каралінскага раёну у выкананьне соцдагавору, па правядзеньню другой бальшавіцкай вясны, які быў складзены паміж Дуруцкай раённай комсамольскай організацыяй (УССР) і Каралінскай. праводзіць вялізарную работу. Так, за апошні час па ініцыятыве ячэйкі організаваны два колгасы з 25 гаспадарак і ў старыя колгасы уступіла 25 гаспадарак.

Комсамольскі абоз па ачыстцы насеньня, ужо абслужыў усе населеныя пункты Сянікоўскага сельсавету і ачысціў больш 40 тон насеньня. 10 комсамольцаў прымацаваны да 4-х колгасаў, якім дапамагаюць выпрацоўваць вытворчыя пляны і растанаўляць рабочую сілу.

Комсамольская ячэйка і піонэратрады сабралі больш 6 тон попелу.

Ячэйка абгаварыла адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР па пытаньню кантрактацыі і вылучыла брыгаду для дапамогі сельсавету ў рэалізацыі і плянаў кантрактацыі ў колгасах.

Дварак.

Ці падрыхтаваным сустракае твой колгас другую большавіцкую вясну?

За рамонтам сельска-гаспадарчых машын

ЗАГАТОЎКІ НАСЕНЬНЯ І ЎГНАЕНЬНЯ ПАД УДАРАМ

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы на Чэрвеньскім раёне яшчэ належна не разгарнулася. На гэтым фронце ёсьць шмат прарываў, якія трэба ліквідаваць ў самы бліжэйшы час. Плян сортаачысткі выкананы на колгасах на 23 проц., у аднаасобнікаў на 18 проц.

Па некаторых сельсаветах (Деманавіцкі і Саваніцкі сельсаветы) нават не абгаварваліся пляны сяўбы У Кліноцкім сельсавеце плян сяўбы месяц праляжаў ў габінэтах. а калі пачалі яго разглядаць, дык опортуністыя скарацілі плян вясеньняй сяўбы на 32 проц.

Нічога ня робіць ў падрыхтоўцы да сяўбы і Райкоопсаюз: не мобілізаваны ўнутраныя рэсурсы жалеза дзеля правядзеньня рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару, нічога ня зроблена па забесьпячэньню колгасаў вбруяй, у якой адчуваецца вялікая патрэба амаль ва ўсіх гаспадарках.

Загатоўка гатунковага насеньня праходзіць вусім дрэнна. Замест 190 цэнтнэраў ячменю загатоўлена толькі 30 цэнтнэраў. Плян па загатоўцы калюшына выканан на 20 проц.

Да гэтага часу Райкоопсаюз не організаваў вучот правядзеньня унутры сялянскіх гатункавых абменных опэрацый. Нездавальняюча абстаіць справа і ў галіне завозу ўгнаеньня. У Чэрвеньскі раён павінна быць завезена ўгнаеньня ў колгасы 510 тон, і ў аднаасобны сэктар 910 тон, завезена усяго 130 тон. На станцыі Пухавічы ляжыць 17 вагонаў вапнянага ўгнаеньня. Попелу трэба было нарыхтаваць 300 тон, нарыхтавана усяго 150 цент.

Школы ў гэтай галіне бязьдзейнічаюць. Усе пададзеныя вышэй факты яскрава гавораць аб бязьдзейнасьці аб самацёку, які пануе у галіне падрыхтоўкі да сяўбы па Чэрвеньскім раёне.

Міхась Ракіта.

Комсамол,—на плянаваньне колгаснай вытворчасьці!

У баёх за рэконструкцыю сельскай гаспадаркі комсамол пад кіраўніцтвам партыі паказаў сапраўдныя ўзоры змаганьня, умеў на-хаду перабудаваць сваю працу адпаведна з задачамі соцыялістычнай гаспадаркі. [illegible] комсамолам на колгаса-саўгасных палёх [illegible] замацаваны тысячамі комсамольцаў, якія сталі у руля трактароў, кіруючы працаю колгасаў, тысячамі комсамольцаў ударнікаў, якія па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне колгасных плянаў.

Заўтра пачне сваю працу Пленум Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ. Х зьезд ЛКСМБ і IX зьезд УсеЛКСМ высунулі перад ўсёй комсамольскай організацыяй, як адну з баявых задач колгаснага будаўніцтва, організацыю працы ў колгасах і барацьбу за плянаваньне колгаснай вытворчасьці.

Ня можа быць правільнай вытворчай формы організацыі працы без пляну, без дакладнага ўліку [illegible] наяўнай сілы гаспадаркі, без вучоту [illegible] устаноўленых норм выпрацоўкі, патрэбы ў гэтай рабочай сіле для кожнай галіны работы і ўсёй гаспадаркі. Без пляну немагчыма правільная растаноўка рабочай сілы [illegible] вытворчасьці, немагчыма [illegible] размеркаваньне рабочай [illegible] нагрузкі [illegible] паасобных гаспадарчых перыодаў году, рацыянальнае скарыстаньне [illegible] рабочай сілы [illegible] у паасобныя гаспадарчыя перыоды. У кожным колгасе павінен быць плян скарыстаньня рабочай сілы, які складаецца на грунце гадавога вытворчага пляну, а потым па перыодах рабочых програм.

Гэтыя пляны складаюцца пры дапамозе шырокіх колгасных мас, контрольныя лічбы шырока абгаварваюцца на ўсіх вытворчых нарадах і сходах, з прыцягненьнем аднаасобнікаў [illegible]. Трэба, каб кожная брыгада, кожны колгасьнік ведаў, што яму неабходна рабіць, [illegible] і колькі, якіх працоўных затрат патрабуе вытворчасьць у кожным квартале, а таксама за гэты год.

Такое давядзеньне контрольных лічбаў вытворчасьці да кожнага колгасьніка стварае ў яго самаініцыятыву не толькі ў іх выкананьні, але і перавыкананьні, ініцыятыву на соц.спаборніцтва і ўдарніцтва, выстаўленьне сваіх сустрэчных контрольных лічбаў.

Аднак, да гэтага часу колгасы мала звярталі ўвагі на [illegible] скарыстаньне запасу сваей рабочай сілы, па павышэньню прац. нагрузкі кожнага колгасьніка. Часта можна сустрэцца з фактам ніякага скарыстаньня працоўнага запасу і нераўнамерных затрат працы ў паасобныя пары году.

Так, у Лельчыцкім раёне рабочая сіла скарыстоўваецца за год на 55,6 проц., у Слуцкім—на 57,5 проц. (з матар'ялаў ін-ту соц.рэконструкцыі с-гаспадаркі); па 9 колгасах БССР 55,1 проц. (з матар'ялаў БАН). Асабліва нізкае скарыстаньне жаночай працы—у Лельчыцкім раёне 42,4 пр., у Слуцкім—49,8 проц., па 9 колгасах БССР—47,5 проц. Асноўная прычына—адсутнасьць дакладнага ўліку працоўнай сілы, правільнага і рацыянальнага яе скарыстаньня.

Падобным фактам [illegible] у данную вясновую пасяўную кампанію колгасы павінны пакласці канец. Уся наяўная рабочая сіла [illegible] павінна быць рацыянальна скарыстана, [illegible] унутры гаспадаркі, за лік пашырэньня прамысловых культур і організацыі падсобных прам.прадпрыемстваў, а значная частка павінна быць накіравана ў прамысловасьць якая ў г. г. патрабуе 11 міл. рабочых рук. Саўгасы і колгасы павінны стаць асноўным пастаўшчыком рабочай сілы ў прамысловасьць.

Каб шырока скарыстаць жаночую працу ў вытворчасьці колгасу і ўзьняць ініцыятыву жанчын, неабходна складаць спэцыяльныя жаночыя брыгады, практыкаваць жаночыя вытворчыя нарады, высоўваць жанчын на адказную работу ў гаспадарцы. Усе гэтыя мэтады—неабходная ўмова вытворчай актывізацыі жанчыны, уздым яе ініцыятывы у справе павышэньня вытворчасьці працы, умацненьня колектыўнай гаспадаркі і барацьбы за масавы колгасны прыліў.

Вучот працы

Ня можа быць добра наладжана вытворчасьць, правільна організавана праца без яе вучоту. Дзеля гэтага вучот у справе організацыі працы і ўсяе гаспадаркі, павінен заняць адно з галоўных месц, яго формы і мэтоды павінны адбівацца на кожным кроку жыцьця гаспадаркі. Калі будзе ўжыты правільны мэтод у вучоце працы, будуць правільна разьмеркаваны і вынікі гадовае вытворчасьці, што стымулюе яшчэ большае падвышэньне вытворчасьці працы.

Да гэтага часу пераважная большасьць колгасу ўлічвала працу ў грашовым выражэньні, што вельмі часта давала повад колгасьніку лічыць сябе за наёмнага рабочага, чым скрыўлялася сутнасьць колектыўнае гаспадаркі, а гэта якраз было на руку кулаку. Падобнаму грашоваму вучоту працы і разрахунку трэба пакласьці канец.

Ацэнку працы і разьлік за яе трэба перавесьці на працоўныя адзінкі, якія атрымоўваюцца ў выніку падрахунку колькасьці і якасьці затрачанай працы.

Вучот працы, а таксама ўсяе гаспадаркі, павінен займаць адно з галоўных месц у рабоце, бо „толькі дасканалая пастаноўка вучоту і контролю, толькі строгая організацыя і працдысцыпліна прывядуць нас да соцыялізму—бяз гэтага соцыялізму няма“. (Ленін).

Соц.спаборніцтва і ўдарніцтва

Адным з важнейшых мэтодаў у справе выхаваньня колгасьніка, здыму вытворчай ініцыятывы мас ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне пляну работ, павышэньне вытворчасьці колектыўнае працы, зьяўляецца соц.спаборніцтва і ўдарніцтва.

Увядзеньне ў практыку колектыўнае працы зьдзельшчыны брыгаднай формы работы, плянавасьці і правільных соц. мэтодаў вучоту працы і разьліку з сябрамі адкрывае шырокія магчымасьці для ўжываньня соц. спаборніцтва як паміж паасобнымі брыгадамі, галінам, колгасамі, так і з паасобнымі саўгасамі і прам. прадпрыемствамі.

Конкрэтнымі задачамі спаборніцтва павінны быць: выкананьне і перавыкананьне контрольных лічбаў пляну брыгады, галіны колгасу выкананьне і перавыкананьне норм выпрацоўкі, павышэньне вытворчасьці працы, палепшаньне якасьці работы, барацьба з гультайствам, разьгільдзяйствам, безгаспадарнасьцю з кулацкімі клясава-варожымі элемэнтамі і настроямі, за ўзорную вытворчую дысцыпліну, за рацыяналізацыю колектыўнае працы.

У другую бальшавіцкую вясну неабходна зьвярнуць максімальную ўвагу на тое, каб ня толькі пашырыць ахоп колгасаў соцспаборніцтвам, але дабіцца яго на 100 проц.

У сучасны момант каля 1/3 усіх колгасаў БССР ахоплена соцспаборніцтвам. Але трэба сказаць, што соцспаборніцтва у гэтых колгасах вельмі часта абмяжоўваецца формальным складаньнем умоў, нікім не контралюецца і застаецца бяз вынікаў. Трэба дабіцца, каб соцспаборніцтва і ўдарніцтва ператварылася ў вышэйшую форму соцмэтодаў вытворчасьці— скразныя брыгады, буксіры і г. д. Гэта—важнейшыя задачы ў працы комсамольскай ячэйкі колгасу.

Вялікае значэньне для палепшаньня якасьці працы і вытворчасьці маюць вытворчыя нарады. Тут абгаварваюцца ўсе дасягненьні і недахопы ў працы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, тут зьбіраюцца прапановы колгасьнікаў аб мэтодах палепшаньня вытворчасьці. Комсамольскія ячэйкі павінны і тут узяць на сябе ініцыятыву каб узьняць працу вытворчых нарад.

Колгасныя кадры

Пытаньні правільнай організацыі колектыўнай працы, гаспадарчага замацаваньне колгасаў ставіць ва ўсю шырыню перад комсамольскімі ячэйкамі колгасамі задачу падрыхтоўкі масавых колгасных кадраў.

Гэтыя кадры дадуць нам курсы па спэцыяльных галінах с.-гаспадаркі, школы колгаснае моладзі, МТС вытворчае вучнёўства пры колгасах, і саўгасах.

Акрамя гэтага, вялікае значэньне мае падрыхтоўка кадраў унутры самой гаспадаркі праз вытворчыя нарады, новыя соцмэтоды вытворчасьці (соцспаборніцтва, ударніцтва), вылучэнства з ліку лепшых колгасьнікаў-ударнікаў асоб, якія карыстаюцца аўторытэтам сярод колгасьнікаў, і г. д. Трэба ўмець знайсьці ў колгасьніку і агранома, і заотэхніка, і мэханіка і організатара. Нічога ня варты такі колгас, які ў сябе ня бачыць іх. Комсамольскія ячэйкі павінны забясьпечыць колгасы патрэбнымі кадрамі масавай кваліфікацыі.

Пераход на соцмэтоды організацыі працы зьяўляецца лепшым залогам у справе замацаваньня колектыўнай гаспадаркі, у справе барацьбы за масавы колгасны прыліў, супроць кулака і яго агентуры—опортунізму ўсіх колераў.

Плевум Цэнтральнага Камітэту комсамолу, на аснове абгаварэньня задач комсамолу ў падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі і колгасным будаўніцтве, павінен намеціць шляхі практычнай дзейнасьці колгасных комсамольскіх ячэек па ажыцьцяўленьню рашэньняў дзевятага зьезду УсеЛКСМ. Комсамольская ячэйка павінна ведаць колектыўную гаспадарку, яе кірунак, паказчыкі посьпехаў і хваробныя месцы, ведаць аб наяўнасьці і скарыстаньні рабочых рук, цяглавай сілы і інвэнтара, стаць ініцыятарам плянавай працы колгасу, стаць актыўным удзельнікам вытворчых нарад, дамагацца, каб яны сталі організуючым цэнтрам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваньня працы вопытнікаў, рацыяналізатараў і вынаходцаў і барацьбы супроць страт колгасаў.

Дзьмітрыеў.

Да II пленуму ЦК ЛКСМБ

Аўладаць мастацтвам перамог у будучых узброеных бойках

Маршруты ваеннай падрыхтоўкі павінны быць програмай баявых дзеяньняў комсамолу

У лютым гэтага году былі высунуты маршруты баявой падтыхтоўкі комсамолу. Яны ставілі сваёй задачай—даць напрамак ваенізацыі комсамольскіх організацый, шырокіх мас рабочай моладзі па аўладаньню ваеннай тэхнікай, тактыкай і стратэгіяй ваенных дзеяньняў.

Матар'ялы, якія сёньня мы друкуем, даюць права констатаваць слабую рэалізацыю маршрутаў.

Трэба адзначыць, што комсамол Беларусі яшчэ ня поўнасьцю ахоплены ваеннай вучобай. Рад організацый безадказна адносіцца да ваеннай падрыхтоўкі (Капыльская, Дрыбінская, Мсьціслаўская, Копыская і інш.). У гэтых організацыях мала зроблена ў тым напрамку, каб да 15 мая даць кожнаму комсамольцу, маладому рабочаму мінімум вайсковых ведаў.

Па цэлым шэрагу раёнаў комсамольскія організацыі нядбайна адносяцца да вывучэньня матар'яльнай часткі ваеннай зброі, ваеннай тэхнікі і структуры Чырвонай арміі. Задача падрыхтоўкі адзіночнага байца выконваецца слаба.

Чырвонаармейскі комсамол Беларусі, не дапамоч грамадзянскім організацыям у ваенізацыі. Задача чырвонаармейскага комсамолу—перадаць свой баявы вопыт рабочай і сялянскай моладзі, стаць ініцыятарам пропаганды ваенна-тэхнічных ведаў, актыўным інструктарам комсамольскіх ячэек. Гэтую адказную задачу комсамол Чырвонай арміі павінен выканаць.

Трэба, каб кожны комсамолец памятаў, што IX зьезд УсеЛКСМ „лічыць немагчымым прабываньне ў шэрагах УсеЛКСМ людзей, якія недаацэньваюць ваеннай небясьпекі, якія ня рыхтуюць сябе да надыходзячых боек".

Набор ў ваенна-морскую школу імя М. В. Фрунзэ

У мэтах павышэньня морскай практы і Ваенна-Морская школа імя М. В. Фрунзэ, замест прыёму 1-га жніўня, утварае прыём з 15 чэрвеня 1931 году па 15 ліпеня.

Усе прынятыя курсанты ідуць на караблі ў плаваньне.

Умовы прыёму застаюцца тыя ж, што і былі апублікаваны.

Прымаюцца на падрыхтоўчы курс Аддзяленьня берагавой абароны асобы з падрыхтоўкай 7-годкі, ва ўзросьце ад 17 да 21 году уключна, на 1-шы спэцыяльны курс—з падрыхтоўкай 9-годкі, ва ўзросьце ад 17 да 22 году уключна.

Узрост лічыцца на 1 сьнежня году прыёму.

Усе прыбыўшыя праходзяць праз мандатную камісію, мэдкамісію і вучэбную.

Усе жадаючыя паступіць у ВМШ павінны зараз-жа падаваць дакуманты і прыбыць у Ленінград не пазьней 15-га чэрвеня 1931 г.

Правілы прыёму і програмы іспытаў можна выпісаць з ВМШ поштай, прыслаўшы ў школу 25 кап. маркамі.

Адрас: Ленинград, 34. Васильевский остров, Набережная лейт.
Шмидта 17. Военно-Морское Училище им. М. В. Фрунзэ

ПРАВІЛЫ
прыёму ў ваенна-морскую школу імя М. В. Фрунзэ

Ваенна-Морская школа імя Фрунзэ рыхтуе страявых камандзіраў флёту і камандзіраў для берагавой абароны.

Прымаюцца на падрыхтоўчы курс і клясу Берагавой абароны з адукацыяй школы 7-годкі, альбо роўнай гэтай школе навучальнай установы (рабфак, ФЗВ і г. д.), ва ўзросьце ад 17 да 21 году уключна.

На спэцыяльны курс—з адукацыяй школы 9-годкі, альбо роўнай гэтай школе навучальнай установы (рабфак і г. д.), ва ўзросьце ад 17 да 22 году уключна.

Паказаны ўзрост лічыцца на 1 сьнежня году прыёму.

Тэрмін навучаньня на падрыхтоўчым—1 год, на спэцыяльным—3 гады і на аддзяленьні Берагавой абароны—3 гады.

Асобы, не дасягнуўшыя 17-гадовага ўзросту на 1/XII году прыёму і тыя, якім болей, чым трэба для паступленьня згодна правіл прыёму—да іспытаў не дапускаюцца.

Рост паступаючага павінен быць ня менш 160 сант., грамадзяне, рост якіх менш 160 сант., у школу ня прымаюцца.

Заявы падаюцца зараз.

Прыём у школу з 15 чэрвеня.

Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакуманты:

1. Мэтрычны выпіс аб нараджэньні, ці дакумант, які яго замяняе.
2. Пасьведчаньне аб адукацыі.
3. Пасьведчаньне ваенна-урачэбнай камісіі, атрыманае па месцу жыхарства, аб годнасьці к паступленьню ў Ваенна-Морскую школу.
4. Рэкомэндацыя для чл. УсеКП(б) і УсеЛКСМ ад свайго колектыву.
5. Спраўка аб нясудзімасьці.
6. Дзьве засьведчаныя фото-карткі.
7. Спраўка аб соц. становішчы паступаючага і яго бацькоў.
8. Члены УсеЛКСМ і УсеКП(б), пражываючыя ў мясцовасьцях, уключаных у разьвёрстку ЦК УсеЛКСМ, падаюць свае заявы з усімі пералічанымі дакумантамі ў бюро ячэек па месцу работы. Бюро ячэйкі, пасьля разгляду гэтых заяў, накіроўвае іх у раённыя (абласныя і акруговыя) камісіі па набору ў Ваенна-Морскую школу.

Пражываючыя ў мясцовасьцях, не ўключаных у разьвёрстку, падаюць свае заявы з пералічанымі дакумантамі ў бюро ячэйкі па месцу работы. Бюро ячэйкі, пасьля разгляду заяў, накіроўвае дакуманты непасрэдна ў школу, указаўшы дакладны адрас паступаючага.

Усе, хто атрымаў па разьвёрстцы ЦК УсеЛКСМ спэцыяльныя камандыровачныя пасьведчаньні, адначасова з апошнімі, атрымліваюць ад бліжэйшых к месцу жыхарства тэркіраўніцтва і ваенкаматаў перавозачныя дакуманты на права бясплатнага праезду ад месца камандыроўкі да г. Ленінграду.

Атрымаўшыя камандыровачныя пасьведчаньні непасрэдна ад школы,—адначасова з гэтым атрымліваюць ад іх і перавозачныя дакуманты.

Прыбыўшым па камандыроўках (за выключэньнем жыхароў г. Ленінграду) даюцца ў школе, на час прыёму, памяшканьні для пражыцьця і бясплатнае харчаваньне.

Прыбыўшыя на камандыроўку, але ня прынятыя ў школу, атрымліваюць ад апошніх перавозачныя дакуманты для бясплатнага праезду да месца жыхарства.

Заўвага: Камандыраванымі лічацца толькі асобы, прыбыўшыя па спэцыяльных камандыровачных пасьведчаньнях ЦК УсеЛКСМ.

Падрабязная програма з правіламі прыёму высылаецца па атрыманьні 25 кап. маркамі.



У барацьбе за выкананьне маршрутаў ваеннай падрыхтоўкі

„Ваеннай тэхнікай аўладаем"

Комсамольская ячэйка гарбарні „Бальшавік" сумесна з рабочай моладзьдзю, організавала паход за вывучэньне ваеннай тэхнікі.

Комсамольцы добра ўсьвядомілі сутнасьць ваеннай небясьпекі, якую рыхтуе капіталістычны сьвет для СССР. Таму комсамольскія організацыі і рабочая моладзь гарбарні „Бальшавік" паставілі сабе задачу—быць падрыхтаванымі да небясьпекі вайны.

З дапамогай падшэфнага конна-артылерыйскага дывізіёну комсамольцы вывучаюць ваенную тэхніку. Ячэйка організуе вечары па пэўных сыстэмах ваеннай тэхнікі.

Конна-артылерыйскі дывізіён на заклік гарбарнікаў адгукнуўся добра.

Зараз наладжана сувязь.

Для кіраўніцтва ваеннай падрыхтоўкай моладзі, дывізіён вылучыў сваіх лепшых інструктароў, якія здолелі паставіць на вышэйшую ступень справу ваенізацыі моладзі гарбарні „Бальшавік".

Я. Контус

120 руб. на дыржабль „Клім Варашылаў"

Колектыў студэнтаў і выкладчыкаў Менскага політэхнікуму, у адказ на шкодніцкую дзейнасьць меншавікоў, якія рыхтавалі ўзброеную інтэрвэнцыю супроць СССР,—узмацняе абароназдольнасьць краіны. На аснове соцыялістычнага спаборніцтва колектыў тэхнікуму абвясьціў збор сродкаў на дырыжабль „Клім Варашылаў". На сёньня сабрана 120 рублёў. Збор працягваецца.

ФРЫД

У баку ад ваеннай падрыхтоўкі

У саўгасах і колгасах Старадароскага раёну вайсковая праца ў занападзе. У колгасе „Бальшавік", „Чырвоны Партызан", „Беларуская Вёска" былі організаваны вайсковыя гурткі, якія не распачаўшы сваёй працы, развалілася, ня гледзячы на тое, што кіраўнікамі былі вызначаны комсамольцы. Пры колгасах былі організаваны ячэйкі Асоавіяхэму, куды уступілі амаль ўсе колгасьнікі. Але з-за адсутнасьці належнага кіраўніцтва, ячэйкі ніякай працы па ваенізацыі не праводзяць. Комсамольскія ячэйкі колгасаў стаяць у баку ад працы ячэек Асоавіяхэму.

На 6-м раённым зьезьдзе саветаў чырвонаармейцы каўэскадрону прынялі шэфства над вайсковай працай у колгасах.

А. Заслаўскі.

Экзамен яны вытрымаюць, але...

Пілсудчыкі паставілі пытаньне аб скарочаньні бюджэту на лячэньне... 30 тысяч душэўна хворых.

„Міністэрства павінна рабіць выбар—экономіць у выдатках на паліцыю, альбо ў справе аховы здароўя".

Для лячэньня 30 тысяч чалавек патрэбны грошы, а матуля Францыя дае, праўда шчодра, але на іншыя патрэбы.

Пілсудчыкі ўзмоцнена праводзяць рэжым экономіі, але экономяць на тым, што не датычыцца ваеннага міністэрства. Яны, напрыклад, да таго даэкономіліся, што для сотні тысяч дзяцей школьнага ўзросту „не хапае" школ. Сотні тысяч беспрацоўных кінуты на галодную сьмерць. Фашысцкі ўрад „ня мае" магчымасьці плаціць ім пэнсіі, бо мае вельмі „бедны" бюджэт.

Урад, які клапоціцца аб дабрабыце краіны, урад, які ня рыхтуецца да вайны, бязумоўна скароціць выдаткі на паліцыю і дасьць магчымасьць 30 тысяч душэўна хворых стаць поўнапраўнымі грамадзянамі. Але пілсудчыкаў мала абыходзіць жыцьцё якіх-небудзь 30 тысяч душэўна хворых.

Іх дэвіз: „усё для вайны". Таму яны, бяз усякіх хістаньняў і гутарак, выбралі адно:—пазьбавіць дзесяткі тысяч душэ на хворых лячэньня і дапамогі. А экономію на лячэньні пусьціць на выдаткі паліцыі.

Што датычыць паліцыі, дык, трэба аддаць справядлівасьць,—пілсудчыкі не шкадуюць сродкаў і маюць натуральныя „дасягненьні". Мы, напрыклад, добра ведаем „працу" паліцэйскіх у вёсках заходняй Украіны і заходняй Беларусі, ведаем і іншыя „гэройствы" паліцэйскіх, за якія даюць ім для заахвочваньня грашовыя ўзнагароды.

Акрамя ўзнагарод і заахвочваньня паліцэйскіх, на тэхнічнае ўдасканальваньне іх узброеньня траціцца мільёны рублёў, украдзеных у беспрацоўных, што паміраць з голаду, і у дзяцей, якія пазбаўлены магчымасьці вучыцца.

„На працягу апошняга году,—піша „Польска Збройна",—у гэтай галіне (тэхнічнага ўдасканальваньня паліцэйскіх ЦВ) зроблена ў нас (у Польшчы П.В.) вельмі, вельмі многа... Ня гледзячы на рад цяжкасьцяў, і ўзбраеньне, транспарт, і сродкі сувязі паліцыі былі удасканалены і развіты...

З гонарам можам заявіць, што ў радзе мерапрыемстваў па ўзброеньню паліцыі мы заказалі заходня-еўрапейскія дзяржавы".

Польскі фашысцкі ўрад сапраўды можа ганарыцца тым, што ў справе ўзбраеньня паліцыі яны „заткнулі за пояс" сваіх падружак—другія „дэмократычныя" краіны.

Польскія паліцэйскія ўзброены газамётамі і гранатамі з удушлівымі газамі. Акрамя гэтага, Польшча ўпяршыню ўжыла спэцыяльныя панцыры для паліцэйскіх. Чаму так клапоціцца за душы паліцэйскіх фашысцкі ўрад?

Ды таму, што клясавая барацьба ўнутры краіны з кожнай хвілінай абвастраецца. Працоўныя і беспрацоўныя Польшчы ідуць у контрнаступленьне, адказваючы гэтым самым на наступленьне фашыстых.

Новы бюджэт міністэрства ўнутраных спраў прадугледжвае ўтварэньне спэцыяльных паліцэйскіх авіоэскадрыльяў і павялічэньне колькасьці паліцэйскіх бранявікоў.

„Ужываньне газаў, сродку па сутнасьці зусім бясшкоднага, не ахоўвае паліцыю ад магчымасьці адстрэлу,—спропагандуе паліцэйскія бранявікі „Польска Збройна".—Клопаты аб бясьпецы паліцэйскіх, выкарыстоўваючых бясшкодныя сродкі, дыктуюць неабходнасьць увесьці паліцэйскія бронемашыны. Асабліва гэта неабходна пры ўціхаміраньні масавых непарадкаў".

„Уціхаміраньне" масавых непарадкаў!

Гэта значыць, што беспрацоўныя і працоўныя Польшы не захочуць памірыцца і ня мірацца з уціскам капіталістычнай эксплёатацыі, а выходзяць на вуліцу з палітычнымі патрабаваньнямі. Вось чаму „дзеяньні паліцэйскіх бранявікоў з газамі, пры разгоне натоўпу, будуць куды больш пасьпяховымі, чым скарыстаньне ў гэтым выпадку пешых, альбо конных атрадаў".

Фашысцкі ўрад добра ведае і цьвяроза ацэньвае сучаснае становішча Польшчы, астрыню яе ўнутранага становішча і пагрозу масавых хваляваньняў.

Беспрацоўныя, даведзеныя голадам і галечаю да адчаю, ня раз ужо выступалі супроць фашысцкага ўраду. Рабочыя, што працуюць у нечалавечых умовах атрымліваюць за сваю пякельную працу грашы, ня раз ужо выступалі супроць ураду голаду і вайны. Фашысцкі ўрад баіцца гэтых выступленьняў, а таму ён шалёна рыхтуецца. Таму „Польска Збройна" піша:

„Калі абставіны прымусяць паліцыю выступіць супроць буйных натоўпаў, якія імкнуцца парушыць правы,—бранявыя машыны і газы вытрымаюць з гонарам свой экзамен".

Што яны вытрымаюць экзамен, мы ў гэтым не сумляваемся.

Нас „хвалюе" толькі адно пытаньне: для каго-ж пагібельнай будзе іх сьмертаносная дзейнасьць?

Цішка Верны

Паведамленьне

15 га сакавіка 1931 г. склікаецца Пленум Мен. Гар. КК.

На Пленум павінны зьявіцца ўсе члены Гарадзкой Контрольнай Камісіі КП (б)Б. Таксама запрашаюцца ўсе парт-засядацелі сакратары партколектываў, ячэек КП(б)Б, Старшыні ФЗМК кіраўнікі шэфбрыгад над дзяржапаратам і над сэктарамі МЦРК.

Пленум пачнецца роўна а 6 гадзіне ўвечары, у залі пасяджэньняў Гаркому КП(б) Б. (Энгельса №28).

Просьба да ўсіх зьявіцца своечасова без спазьненьня.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599